**Новік М.І. (Брэст)**

## Свет афарыстыкі Максіма Багдановіча і Ніны Мацяш

Асоба і творчасць Максіма Багдановіча прыцягвала і прыцягвае ўвагу чытачоў і навукоўцаў. Нягледзячы на спробы разгадаць «загадку Багдановіча», так і да сёння застаюцца дарэшты нявытлумачальнымі чары ягоных твораў. І сакрэт тут як у незвычайным лёсе паэта, так і ў высокай эстэтыцы ягонага мастацкага слова. Прыцягальнымі з'яўляюцца высновы маладога паэта-філосафа пра сэнс жыцця, пра красу чалавека і прыроды, пра красу і сілу мастацкай творчасці, развагі пра жыццё і смерць. Многія назіранні і высновы Максіма Багдановіча ўяўляюць сабой лаканічныя афарыстычныя выказванні. Паэт-інтэлектуал і сам знаходзіў такія выслоўі ў іншых творцаў, браў іх у якасці эпіграфаў да сваіх вершаў. Гэтаму спрыялі пераклады твораў еўрапейскіх аўтараў, у якіх сустракаў ён сугучныя сваім развагам і разуменню ісціны. Можна прыгадаць, як гучаць, перастворaныя М. Багдановічам, радкі: з П. Верлена – «Трэ нам, бачыш, усё між сабой дараваць, / – Так хоць шчасце нарэшце спаткае абох» [1, с. 169]; з Ф. Шылера – «Хочаш сябе ты пазнаць, – / паглядзі на людзей, на іх справы; / Хочаш людзей зразумець, – / Ў сэрца сваё загляні» [1, с. 375].

Цэлы шэраг твораў М. Багдановіча маюць эпіграфы – радкі з твораў вядомых аўтараў. Выбар афарыстычных радкоў сведчыць пра імкненне і здольнасць паэта разважаць ужо ў сваім паэтычным творы пра сутнасць выказанага ў кароткім выслоўі. Варта прыгадаць, напрыклад, што эпіграфам да цыкла «Вольныя думы» сталі радкі Г. Гейнэ: «Мая горыч вынікае толькі з горычы маіх чарніл, а калі ёсць у мяне атрута, то гэта нішто іншае, як проціяддзе». Даўно сталі крылатымі словы Максіма Багдановіча з гэтага твора: «Хваробы лечаць і атрутамі» [1, с. 127]. Выразнымі з'яўляюцца і наступныя эпіграфы: да «Санета» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі…») узяты радкі з Н. Буало – «Беззаганны санет варты адзін цэлай паэмы», да верша «Маёвая песня» – радок П. Верлена «Музыкі перш за ўсё»; а да верша «Белы крыж, пліта...» – лацінскае выслоўе «Disce mori» (Вучымся паміраць). Своеасаблівы дыялог геніяльных паэтаў назіраем у другой частцы цыкла «Думы» М. Багдановіча, дзе прыводзяцца радкі Я. Баратынскага: «С Израилем певцу один закон: / Да не творит себе кумира он», а побач – выказванне аўтара «Вянка»: «Кожны чалавек з'яўляецца вучнем якога-небудзь глыбокага слова». Сугучна Пушкінскім радкам «Цветы последние милей / Роскошных первенцев полей», якія ўзятыя эпіграфам, гучаць радкі верша М. Багдановіча: «Плакала лета, зямлю пакідаючы; / Ціха ліліся слязінкі на поле. / Але прыгожаю восенню яснаю / Там, дзе упалі яны, выраслі / Кветкі асеннія, кветкі, ўспаённыя / Тугаю, горам, слязінкамі лета» [1, с. 67].

Паэт трагічнага лёсу больш тонка адчувае праявы цёмнага і светлага, прыгожага і пачварнага. Філасофскае асэнсаванне зямнога быцця і пазнання сябе ў неабдымнай прасторы Космасу выяўляецца ў паэзіі М. Багдановіча ў радках, якія маюць афарыстычнае гучанне: «Маладое жыццё праляціць, прабяжыць, – / Не забудзься вясёлых калёраў зажыць» [1, с. 311]; «Няма горш бяды / як рыдаць ні з чаго» [1, с. 174]; «... Чалавечай душы таксама / Няхораша мацаць рукамі. / Далікатныя людзі самі ведаюць гэта, / А недалікатным аб гэтым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

напамінаюць» [ 1, с. 425]; «Па-своему кожны свой век пражывае, / У кожнага неба і сонца свае» [1, с. 192]; «Так многа ёсць паўсюль багацтва і красы, / А людзі нішчацца у голадзе, у зморы / Ад беднаты, ад цемнаты, / Бо скрозь – мяжы, бо скрозь – платы» [1, с. 274]; «Ах, колькі ёсць красы цудоўнай поруч з намі, / Калі глядзець вакол дзіцячымі вачамі!» [1, с. 244].

З афарыстыкай Максіма Багдановіча паводле свайго філасофскага напаўнення сугучная афарыстыка Н. Мацяш. Ёсць агульнае ў іх лёсе, у драматызме жыццёвых перажыванняў, невыпадкова адзін з вершаў паэткі «Між квецівам снегу і белай сняжніцаю вішні», прысвечаны М. Багдановічу. У гэтым творы ёсць прысутнасць і Д. Бічэль: менавіта з яе слоў пачынаецца твор. Так метафарычна абазначыла Н. Мацяш жыццёвы шлях паэта і сваё стаўленне да яго: радасць ад нараджэння і прыходу на гэты белы свет у месяцы снежні будучага сусветна вядомага паэта – квеціва снегу. І холад снежны ад страты маладога аўтара «Вянка» ранняй вясною – сняжніца вішні. Між квецівам снегу і белай сняжніцаю вішні разгортвалася дарога жыцця М. Багдановіча. Агульнасць іх лёсаў адзначыла Д. Бічэль у пачатку верша: «– Ён быў твайм братам, – сказала сястрыца Данута. – / Абыдзены шчасцем, шчэ больш безнадзейны ў пакутах. / Скажы пра Яго!... Памаліся. І будзеш пачута» [2, с. 447] .

Другая частка верша – роздум Н. Мацяш пра М. Багдановіча, пра ягоны і свой драматычны лёс, пра сумоту й самоту творчай душы, пра шуканне красы духоўнай, пра лёс роднай мовы і роднага краю, пра вечнае і часовае, мінальнае:

А мне – заціяло... Хоць сябе й пачуваю сястрою.
Самотай Паэтавай сэрца самотнае крою.

Між квецівам снегу й пяшчотнай сняжніцаю вішні
Адшчодрыў палёту Яму над юдоллю Ўсявышні.

Крылатых заўжды асмяецца бяскрылымі ўсімі,
Зняважыцца імі, адпрэчыцца імі, Максіме.

Мінецца зямное – і немач, і пыха, і зверства,
і стома змагання, і ў лепшую долю няверства.

Адно не міне, не замосціцца – прорва самоты
Духоўнай істоты ў шуканні Красы між марноты.

Ці ж толькі ад жалю да нашае нэндзы краёвай
Бог вусны Твае растуліў беларускаю мовай?!

Не на праміnанне блукае вярэдліва рэха
Між цёплай сняжніцаю вішні і квецівам снегу!.. [2, с. 447]

Так, ведучы дыялог з Паэтам, Н. Мацяш гаворыць пра духоўную еднасць з ім, пра вернасць роднаму слову, пра веру ў будучыню беларускага слова, веру ў вечнае жыццё ідэалаў Красы. Прыгадаем тут толькі асобныя радкі Н. Мацяш з розных зборнікаў, каб пачуць жывы дыялог светлых і мужных творцаў: «У птахаў толькі смерць хіба адніме / Шлях да айчыны, / Да нябёс яе» [3, с. 55 ];

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«Дабрата не імпульс, не парыў, / Не адзінкавы усплёск эмоцый, / Калі ёй нададзена тварыць / Чалавека з болю і самоты» [3, с. 37]; «Не памыляецца наканаванасць» [4, с. 26]; «Травінка кволая – / І тая не ўзрастае / Дзеля самой сябе» [4, с. 24]; «Клятвы – ноша непасільная для сэрца» [4, с. 25]; «Адзінота – шчэ не паражнеча» [4, с. 29]; «...Пакуль не мірыцца душа / З асыцеласцю і прыніжэннем – / Чалавек не знае паражэння» [4, с. 44]; «Што чакае за крутой гарой – / Выявіцца толькі на вяршыні» [4, с. 64]; «Павага – самае святое, / Бо людзей з нас лепіць на зямлі» [4, с. 64]; «Мы ўсе – з любові, / ўсе мы – да любові, / А як жа мы прад ёю ўсе ў даўгу!..» [5, с. 38]; «Чым меней праўды, тым гусцейшы морак» [5, с. 63]; «Адной любоўю можна стому, / жыццё і скон свой апраўдаць» [6, с. 63]; «Дух бачыць далей і глыбей, чым зрок...» [6, с. 17]; «Свет шчэ ўсё гожы, / шчэ ўсё каляровы» [6, с. 76]; «Няма мацнейшай кары, як самота, / Няма агню пякельней, як згрызоты, / Няма тугі чарней тугі нямой» [6, с. 88]; «Усё на свеце – прахлы дым, / Не памірае толькі тое ў ім, / Што ёсць тварэннем духу чалавека» [6, с. 94].

Творчасць М. Багдановіча і Н. Мацяш багатая на трапныя лаканічныя выказванні, у якіх – здабытая імі праўда жыцця, высновы таленавітых і ўражлівых творцаў, якія мужна трывалі боль, адчай, самоту й сумоту і змагаліся за святло, гожасць і шматколернасць людскіх узаемаадносінаў, за светласць зямнога бытавання. Ёсць агульнае ў развагах Паэта і Паэткі, аддаленых у часе, аднак такіх блізкіх і родных, у спасціжэнні сэнсу жыцця людскога, жыцця свайго народа, у асэнсаванні духоўнай моцы творчай асобы. Здабытая імі мудрасць ёсць духоўная каштоўнасць, скарб душы – чалавека і народа.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, даследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.
2. Мацяш, Н. Душою з небам гаварыць : выбраная лірыка / Н. Мацяш. – Мінск, 1999.
3. Мацяш, Н. Поўны келіх : лірыка / Н. Мацяш. – Мінск, 1982.
4. Мацяш, Н. Жнівень : лірыка / Н. Мацяш. – Мінск, 1985.
5. Мацяш, Н. Шчаслівай долю назаві... : лірыка / Н. Мацяш. – Мінск, 1990.
6. Мацяш, Н. У прыгаршчах ветру : вершы, пераклады, эсэ / Н. Мацяш. – Мінск, 2009.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ